# Паэт з вёскі Каралішчавічы

***У бібліятэцы Навадворскага цэнтра традыцыйнай культуры з удзелам вучняў 5-10 класаў адбылася вечарына, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Язэпа Пушчы.***

Нарадзіўся паэт у в.Каралішчавічы, у сялянскай сям"і. Ён рана далучыўся да працы і ў дванаццаць гадоў, па яго словах, «у касьбе амаль не адставаў ад дарослых». Шмат вучыўся, працаваў вясковым настаўнікам, выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры, а пазней быў адным з заснавальнікаў літаратурнага аб"яднання «Маладняк». Стаў шырока вядомы. Быў на працягу жыцця арыгінальным, народным, па сваёй сутнасці, паэтам, які аказаў вялікі ўплыў на беларускую паэзію тых гадоў.

Імкненне паставіць на службу народа сваё майстэрства, аддаць людзям свой багаты душэўны і паэтычны скарб, «сэрцам сагрэць людзей» былі лейтматывам усёй творчасці Язэпа Пушчы да таго дня, калі пяро выпала з яго рук, не дапісаўшы задуманага, галоўнага... Пахаваны паэт у в.Каралішчавічы, дзе і пачалося мерапрыемства, якое працягвалася ў бібліятэцы.

Вучні 10 класа падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю. Пад гукі цымбалаў ішла гаворка аб жыцці і творчасці паэта, гучалі яго вершы.

На вечарыне прысутнічала дачка паэта Лідзія Іосіфаўна Шпакоўская, якая ўспамінала аб цудоўным каханні сваіх бацькоў, аб турботах, якія выпалі на долю іх сям"і. У канцы выступлення Лідзія Іосіфаўна выказала падзяку загадчыцы бібліятэкі Г.М. Юзуфовіч за арганізацыю вечара, прысвечанага памяці яе бацькі.

**Наталля БАРОДЗЬКА,**
**загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Мінскай РЦБ.**